# НОВАЕ ПАЛЕССЕ

**В. ЛАБАНОК,**
сакратар Палескага абкома КП(б)Б

Аб мінулым, дарэвалюцыйным Палессі ў свой час шмат пісалася. Каб уявіць сабе гэтае мінулае, дастаткова прывесці хоць-бы некалькі назваў палескіх вёсак, такіх, як Глушкавічы, Глухавічы, Сухавічы, Жахавічы, Махаеды, Залатуха, Гноева, Гнойнае, Пагарэлае і інш. Гэтыя назвы — сведкі горкай долі беларускага селяніна-палешука пры праклятым царскім ладзе.

У трэцім томе выданай у 1882 г. працы «Жывапісная Расія» аб Палессі напісана:

«Сярод балот, на беразе Брагінкі і невялікага возера — мястэчка Брагін. Нарэшце вялікая казённая вёска Васілевічы, ляжыць на рубяжы непраходных балот... Гэта апошнія жылыя пункты. Далей цягнецца царства туманаў, лясоў і балот.

Як ні малазначныя гэтыя мястэчкі, яны маюць тут велізарнае значэнне. Гэта аазісы сярод змрочнай і пустыннай прыроды, куды хоць раз або два разы ў год збіраюцца жыхары такіх самых меншых аазісаў, каб задаволіць свае патрэбы, каб зірнуць на людзей і перакананца ва ўласным існаванні».

У царкоўным часопісе «Минские епархиальные ведомости» № 21 за 1887 г. аб жыхарах Мазырскага павета надрукавана: «Для гэтых балотна-лясных жыхароў самы свет канчаецца за межамі роднага паселішча. Жыццё гэтых людзей асуджана на вечную барацьбу з прыродай...»

Так пісалі аб Палессі аматары экзотыкі з лагера ліберальна-буржуазнай інтэлігенцыі, якія часам прыязджалі на Палессе, захапляліся першабытнай, некранутай прыгожасцю яго прыроды і дзеля прыстойнасці, з панскай спагадлівасцю выказвалі свой жаль з прычыны цяжкага жыцця яго жыхароў.

З гэтай асуджанасці, галечы і беспрасветнай цемры не было, здавалася, выхаду. Вечнымі спадарожнікамі палешукоў, як і ўсяго беларускага народа, заставаліся-б галеча і бяспраўе, непісьменнасць і розныя хваробы, як трасца, залатуха, каўтун і іншыя, калі-б не Вялікая Кастрычніцкая социялістычная рэвалюцыя, слаўная партыя Леніна — Сталіна, брацкі рускі народ.

За гады совецкай улады Палессе ў корані пераўтварылася.

З кожным годам расшыраліся пасеўныя плошчы, няўхільна павышалася ўраджайнасць, павялічвалася пагалоўе грамадскай жывёлы і яе прадуктыўнасць. Палескія балоты, якія раней былі крыніцай галечы, хвароб і бездарожжа, воляй совецкіх людзей пачалі пераварацца ў высокаўраджайныя лугі і пашы — крыніцу багацця калгасаў і калгаснікаў.

Там, дзе раней не магла ступіць нага чалавека, з'явіліся пасевы зерневых, тэхнічных і гародніных культур, выраслі ўзорныя соўгасы «Ведрыч» і «Перамога социялізма», бяскрайнія, як стэп, калгасныя масівы. На калгасных і соўгасных палях працавалі сотні трактароў і камбайнаў, вялікая колькасць складаных малатарань, сеялак, культыватараў, лушчыльнікаў і іншых сельскагаспадарчых машын. Расла прамысловасць вобласці, павышаўся культурны ўзровень і матэрыяльны дабрабыт насельніцтва.

Нямецка-фашысцкія захопнікі нанеслі народнай гаспадарцы Палесся велізарную шкоду. Зусім была знішчана прамысловасць вобласці, разграблены калгасы, соўгасы і машынна-трактарныя станцыі, разбураны культурныя ўстановы. У «зону пустынь» спрабавалі гітлераўскія бандытыператварыць Палескую вобласць, якая з'яўлялася вялікай базай для разгортвання ўсенароднага партызанскага руху. Дашчэнту быў спален Лельчыцкі раён, пераважная большасць населеных пунктаў Капаткевіцкага, Петрыкаўскага, Даманавіцкага, Ельскага і іншых раёнаў вобласці.

Пасля пераможнага сканчэння Вялікай Айчыннай вайны працоўныя вобласці, разам з усім беларускім народам, апіраючыся на велізарную дапамогу партыі і ўрада, прарабілі вялікую работу па аднаўленні і далейшаму развіццю народнай гаспадаркі. Там, дзе яшчэ шэсць гадоў таму назад былі толькі руіны і папялішчы, зараз кіпіць бурнае стваральнае жыццё.

Адроджана прамысловасць вобласці, цалкам разбураная фашысцкімі захопнікамі. Магутнасць Мазырскай дзяржаўнай электрастанцыі ў шэсць разоў перавышае даваенную. Электраэнергіяй Мазырскай ГЭС зараз карыстаецца не толькі абласны цэнтр, але таксама горад і чыгуначны вузел Калінкавічы, раённы цэнтр Ельск, многія калгасы Мазырскага і Калінкавіцкага раёнаў.



Сакратар Палескага абкома КП(б)Б В. Лабанок.

Лясная прамысловасць, якая з'яўляецца галоўнай галіной прамысловасці вобласці, забяспечана вялікай колькасцю механізмаў, якія зусім пераўтварылі характар працы палескіх лесарубаў і возчыкаў. За апошнія чатыры гады магутнасць механізмаў лесанарыхтоўчых прадпрыемстваў павялічылася больш чым у чатыры разы, з кожным годам паступае ўсё больш і больш электрапіл, лесавозных аўтамашын, магутных тралёвачных трактараў, паравозаў, лябёдак, пагрузачных кранаў.

За пасляваенныя гады ў Мазыры пабудаван буйны дрэваапрацоўчы камбінат, прадукцыя якога зараз накіроўваецца на будаўніцтва Волга-Донскага канала і іншыя вялікія будоўлі комунізма. Адноўлен і нанова створан рад лесапільных, мэблевых, абоза-калёсных прадпрыемстваў. Вялікае месца ў вобласці займае лесахімічная прамысловасць. Палескі хімлеспрамгас нядаўна заняў другое месца ва ўсесаюзным социялістычным спаборніцтве прадпрыемстваў лесахімічнай прамысловасці. Створана таксама значная колькасць прадпрыемстваў харчовай, рыбнай, мясамалочнай, лёгкай, мясцовай прамысловасці і арцелей прамысловай кааперацыі.

Прамысловасць вобласці з года ў год павялічвае выпуск валавай прадукцыі і паляпшае яе якасць. У 1950 г. выпуск валавай прадукцыі склаў 230,4% у параўнанні з 1947 г.

Значныя поспехі дасягнуты калгаснікамі і калгасніцамі, работнікамі МТС і соўгасаў, спецыялістамі сельскай гаспадаркі Палесся ў галіне сельскай гаспадаркі. Даваенны ўзровень пасеўных плошчаў ужо ў 1950 г. быў значна пераўзыйдзены. Асабліва выраслі пасеўныя плошчы такіх важнейшых харчовых

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы